**Валахановіч С.А.,** *аспірантка*

# З ГІСТОРЫІ ЭСТЭТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ ДЗЯЦЕЙ У БЕЛАРУСКАЙ СЯМ'І
(канец XIX — пачатак XX ст.)

З даўніх часоў чалавецтва ўсведамляе сябе праз культуру. І каб усведамленне было праўдзівым і гістарычным, вельмі важна вялікі пласт культуры - духоўную спадчыну народа - аднавіць і захаваць, данесці да свядомасці нашага пакалення.

Народная духоўная культура мае, акрамя ідэйнай, маральную і мастацкую каштоўнасці. Яе багатыя карані - гэта маральна-этычныя нормы жыцця, фальклор з непаўторнымі казкамі, песнямі, прымаўкамі, прыказкамі, загадкамі, прыметамі; моўнымі сродкамі (пацешкамі, забаўлянкамі, лічылкамі, скорагаворкамі, калыханкамі), гульнямі, а таксама спрадвечнымі святамі і абрадамі. Вядома многа народных гульняў, якія развіваюць інтэлект дзіцячай душы, выхоўваюць найтанчэйшую адчувальнасць, лёгкасць рухаў і інш.

У сем'ях нашых продкаў закладваліся традыцыі народнай этыкі і эстэтыкі. Выхаваць дзяцей — значыць навучыць іх добрасумленнасці, працавітасці, самастойнасці, прывіць культ маці і бацькі. Гэтыя чалавечыя якасці выкрышталізоўваліся праз сямейныя традыцыі. Бацькі выхоўвалі дзяцей не назойлівай мараллю, а «адным сваім існаваннем, створанаю імі атмасферай».

Сёння мы падкрэсліваем, што многа сем'яў распадаецца. Гэта сімптом хваробы, якая называецца бездухоўнасцю. Некаторыя рэцэпты можна аднавіць праз знаёмства з этычнымі і эстэтычнымі нормамі нашых прадзедаў.

Станаўленне духоўнага свету дзіцяці - гэта перш за ўсё ўзбагачэнне яго светапогляду духоўнымі каштоўнасцямі праз удзел у народных святах, дзе дзеці набывалі першыя ўрокі дабрыні і хараства. Так, напрыклад, М.Багдановіч любіў святкаванне Дзядоў, Каляд, Гукання вясны, Вялікадня. У сям'і быў звычай паставіць свечкі ў святочны пірог, а потым задзьмуць іх, загадваючы жаданне.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сярод метадаў і сродкаў сямейнага выхавання вядомы беларускі педагог А.Я.Багдановіч выдзяляў родную мову (яе мілагучнасць і пявучасць), народную творчасць, нацыянальную гісторыю і культуру, родную прыроду. Адам Ягоравіч імкнуўся даць сваім дзецям «маленькі і закончаны круг ведаў». Ён падбіраў матэрыялы па гісторыі, геаграфіі, заалогіі, фізіцы, апісанне вандровак, урыўкі з кніг, даступных для дзіцячага ўзросту.

Асноўнымі крыніцамі мастацкіх уяўленняў дзяцей у сям'і сёння з'яўляюцца кніга, прырода і тэлебачанне, аб чым сведчаць матэрыялы анкетавання.

У народных сродкаў уплыў на эмацыянальны свет дзіцяці, яго эстэтычнае развіццё адбываўся праз спалучэнне любві да працы («У каго не робяць рукі, у таго не робіць і галава») і назіранне прыроднага асяроддзя, з'яўлялася «камертонам» для духоўнай асалоды, для ўспрымання гармоніі і прыгажосці раслінага і жывёльнага свету. Дзеці мелі магчымасць назіраць за тым, што рабілі бацькі (вырабы керамікі, ткацтва, інкрустацыі па дрэве). Калі нараджалася дзяўчынка, ёй дарылі маленькі калаўрот, а к дзесяці гадам давалі заданне наткаць палавічкі. Такім чынам дзяўчынка далучалася да ткацтва і вышыўкі. Колер, арнамент, дасканалая форма рэчаў дапамагалі з ранняга ўзросту ўзбагаціць пачуцці і садзейнічалі эстэтычнаму выхаванню.

Шматлікія народныя песні сямейна-абрадавага цыкла (радзінныя, вясельныя, пахавальныя) і каляндарна-абрадавага цыкла (талаковыя, купальскія, валачобныя, калядныя, веснавыя) выхоўвалі такія чалавечыя якасці, як спачувальнасць і адкрытасць душы, фарміравалі мастацкі густ дзяцей.

У канцэнтраванай форме эстэтычныя сродкі выхавання выкарыстоўваліся на народных святах, дзе гучала музыка, спявалі песні, танчылі, жартавалі, успаміналі цікавыя гісторыі. Жанчыны мелі магчымасць апрануць на свята касцюм, зроблены сваімі рукамі. Святочнае адзенне - гэта яркая мастацкая з'ява.

Бацькі, і перш за ўсё ўважлівая і добрая маці, без якой і «сонца не грэе», былі выдатнымі педагогамі, таму што добра валодалі мовай казак (а казка - гэта першая сустрэча з пытаннем

«дабро-зло»), жартаў, пацешак, вясёлых усмешак. З іх дапамогай развівалі ў раннім дзяцінстве унікальную дзіцячую фантазію, выкарыстоўваючы такія метады, як назіранне, прыклад, прывучэнне, гульня.

Падсумоўваючы сказанае, можна адзначыць, што дзеці чэрпаюць духоўныя праменьчыкі ад сваіх бацькоў, а потым дзеляцца гэтымі здабыткамі ўжо са сваімі дзецьмі. У Беларусі цяпер складаны час, і трэба, каб дзеці, народжаныя тут, успрымалі сябе гаспадарамі, ведалі, што, каб застацца самім сабой, жыццёва неабходна сцвярджаць сябе.

Зварот да праблемы эстэтычнага развіцця ў беларускай сям'і (канец XIX - пачатак XX стагоддзя) дапаможа знайсці бацькам парады і мудрыя думкі, некаторыя ўзоры па вырашэнню складаных пытанняў выхавання, узбагаціць выхаваўчы працэс. Народная мудрасць сцвярджае: «Цуды робяць людзі, а не святыя». І, вядома, гісторыя і культура пачынаюцца не з нас, а з мінулага.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ